



# ПРЫГОДЫ ГРАМАДСКАГА НАЗІРАЛЬНІКА








http://www.belaruswatch.org/
http://www.lawtrend.org/
http://spring96.org/
http://www.belhelcom.org/

2014

# ПРЫГОДЫ ГРАМАДСКАГА НАЗІРАЛЬНІКА

## СУДЫ

Год таму ў беларускай судзебнай прасторы з'явіўся дакумент[1], у якім дакладна і даступна тлумачылася права любога беларускага грамадзяніна прысутнічаць на адкрытых судовых паседжаннях з магчымасцю бесперашкоднага ажыццяўлення гуказапісу. З'яўленне гэтай пастановы парадавала грамадзянскую супольнасць і ўзмацніла надзею на тое, што праца судоў стане больш публічнай і даступнай для звычайных грамадзян.

Але адной толькі надзеі нашай камандзе[2] падалося мала, таму мы вырашылі праверыць гэта на практыцы. Мы сабралі групу прыблізна з 30 неабыякавых беларусаў, правялі трэнінгі па юрыдычных аспектах і правілах назірання, узброіліся дыктафонамі, асадкамі, паперай і адправіліся ва ўсе раённыя суды Мінска. Цягам ліпеня 2014 года нашая каманда наведала 149 адміністрацыйных, грамадзянскіх і крымінальных паседжаняў, якія былі праведзеныя больш чым 90 рознымі суддзямі.

Негледзячы на тое, што некалькі з нашых назіральнікаў былі выгнаныя нядбайнымі суддзямі, большасць усё ж такі пpaназіралі без перашкодаў. Мы сабралі інфармацыю і прааналізавалі яе па такіх паказчыках, як доступ да будынку суда, публічнае інфармаванне аб паседжаннях, магчымасць прысутнічаць на іх, а таксама магчымасць ажыццяўлення гуказапісу. Больш дэталёва са справаздачай можна азнаёміцца на сайтах нашых арганізацый.

Але каб даць магчымасць дакрануцца да рэальных гісторый па-за сухімі лічбамі і юрыдычнымі тэрмінамі, мы зрабілі гэты невялічкі зборнік коміксаў, заснаваных на падзеях, якія адбыліся з нашымі назіральнікамі. Таму, каб паглядзець на рэальныя гісторыі, хутчэй гартай старонку!

---

[1] Пастанова №11 пра забяспячэнне галоснасці пры ажыццяўленні правасуддзя і распаўсюджванні інфармацыі пра дзейнасць судоў ад 20 снежня 2013 года

[2] Назіранне ажыццяўлялася ў супрацоўніцтве няўрадавых арганізацый "Belarus Watch", Цэнтра прававой трансфармацыі "LAWTREND", Праваабарончага цэнтра "Вясна" і РПГА "Беларускі Хельсінскі Камітэт".

# ІШЛА-ІШЛА І ДА ВАС ЗАЙШЛА







Вы што, вядзеце запіс?
Так, я ж маю на гэта права.
А Вам што, больш няма чаго рабіць?
ЗАЛЯ СУДА
А, дык гэта праваабаронцы, ведаю, я чытала іх справаздачы.
Дык вось, у адпаведнасці з пастановай пленума Вярхоўнага суда наведванне і аўдыёзапіс адкрытых паседжанняў дазволены.
ЗАЛЯ С
Эм... ну, дык Вы ж там відэа здымаць хацелі...



# ПРЫГАВОР НА КАЛІДОРЫ

*назіральніца*




А калі будуць разглядаць справу грамадзяніна ў калідоры?
Прозвішча абвінавачанага?
Не ведаю, на стэндзе няма інфармацыі. Калі б была, я б вам, канешне, сказала.
Ну тады і я не ведаю.
Ну ён сядзіць у калідоры, і да яго толькі што падыходзіў міліцыянт з дакументамі…
А, дык разгледжана!
Як разгледжана? Ён жа нават не заходзіў у кабінет!
Дык ён віну прызнаў на калідоры!
Так, далі штраф 10 млн, парушыў нагляд – вярнуўся да хаты на гадзіну пазней.
Справа перанесена.
Ты што, ёй усё распавёў?!
Дык а што… я ж нічога… я ж не ведаў…



# ТОРТ ДА ГАРБАТЫ

назіральнік







Перапынак да вынясення рашэння. Усіх запросяць назад праз некалькі хвілін.
ПЕРАПЫНАК
А ну дык вось Вам торцік, адпачнеце, з гарбаткай пап'еце.
СУДДЗЯ
Эм, ды не трэ...
Вы б лепей пазбягалі такіх шчодрых жэстаў перад вынясеннем рашэння
ЗАЛЯ СУДА
А я што? Я ж нічога такога. Няхай людзі гарбаткі пап'юць з торцікам.

# Інстытут высакародных грамадзянак







Ладна. Вунь у тыя дзверы.
ЗАЛЯ СУДА
А не, у тыя...
...а можа тыя...
А Вы хто будзеце?
Я проста на паседжанні папрысутнічаць хачу, як звычайная грамадзянка.
СУДДЗЯ
Што значыць проста папрысутнічаць? Гэта што, “Інстытут высакародных грамадзянак”? А ну вон адсюль!












LAWTREND
исследования образование действия

БХК

ВЯСНА
праваабарончы цэнтр

BELARUS WATCH